

ЦЯЖКІ ШЛЯХ У ХАТЫНЬ 13

«ВЫБРАНЫЯ СТАРОНКІ» АМАРА ХАЯМА 16



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

25 САКАВІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 58 (29680)

КОРАТКА

• Сярэдні заробак у Беларусі ў лютым склаў Br1563.

• Прэм'ер-міністры Беларусі і Таджыкістана абмеркавалі гандаль і прамбяспеку.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ГРАНКОЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў:**

*«Было прынята рашэнне Саветам Еўразійскай эканамічнай камісіі аб прымяненні тарыфнай ільготы па вызваленні выплаты мытнай пошліны на ўвозімыя электрамабілі. Прыемная навіна для грамадзян Беларусі, Арменіі, Кыргызстана і Казахстана. Гэтае рашэнне — непасрэднае адлюстраванне той паслядоўнай і сістэмнай работы, якая праводзіцца ў нашай краіне па развіцці электратранспарту. Летась, згодна з даручэннем Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, была распрацавана і зацверджана комплексная праграма па развіцці электратранспарту на 2021—2025 гады. Выкананне гэтай праграмы мы ўжо можам рэальна адчуць на сабе, бачачы на дарогах усё больш аўтамабіляў з характэрнымі зялёнымі нумарамі. І гэтае апошняе рашэнне з'яўляецца хоць невялікім, але крокам наперад на шляху далейшай інтэграцыі краін — удзельніц ЕАЭС».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы ў любых складаных выпадках знойдзем сродкі, каб падтрымаць і трэнераў, і спартсменаў»

### Пасля няўдалага выступлення айчыннай каманды на зімовай Алімпіядзе Прэзідэнт паставіў задачу правесці маштабную рэвізію сферы спорту

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб выніках удзелу беларускіх спартсменаў у зімовых Алімпійскіх гульнях і перспектывах развіцця зімовых відаў спорту ў краіне. У Палац Незалежнасці запрасілі больш за паўсотню гасцей — прадстаўнікоў НАК, старшынь федэрацый, трэнераў, профільную вертыкаль абласной улады.**

**Зімовыя Алімпійскія гульні, якія прайшлі ў Пекіне, паставілі перад беларускім спортам мноства пытанняў. Медальныя чаканні беларускіх аматараў спорту і кіраўнікоў сферы, мякка кажучы, не спраўдзіліся нават у традыцыйна паспяховых для нашай краіны відах. З зімовага Пекіна беларускія спартсмены прывезлі толькі два сярэбраныя медалі. Прызёрамі сталі фрыстайлістка Ганна Гуськова і біятланіст Антон Смольскі. Вынік выступлення — 24-е месца ў неафіцыйным медальным заліку краін. Для параўнання: на Алімпійскіх гульнях 2018 года было 14-е. Зусім блізка да алімпійскага п'едэстала былі канькабежац Ігнат Галавацюк, біятланісткі Ганна Сола і Дзінара Алімбекава.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Водбліскі

# ПАМЯЦЬ ЯК ПАПЯРЭДЖАННЕ

### На Гомельшчыне пракуроры папаўняюць музейныя экспазіцыі аб генацыдзе беларускага народа

**Гомельская абласная пракуратура не толькі расследуе крымінальныя справы аб генацыдзе беларускага народа, але і дапамагае ствараць тэматычныя выставы для раённых музеяў. Завяршаецца работа і па ўстанаўленні лёсу ўсіх спаленых у часы нацысцкай акупацыі населеных пунктаў у рэгіёне.**

## НЕСУЦЕШНЫ БОЛЬ

У Год гістарычнай памяці, пасля ўступлення ў сілу Закона «Аб генацыдзе беларускага народа» і ўстанаўлення Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа (22 чэрвеня) значэнне такой маштабнай работы органаў пракуратуры цяжка пераацаніць. Супрацоўнікі ведамства ставяць для сябе задачу не толькі аднавіць гістарычную праўду аб падзеях тых часоў, але і не дапусціць фальсіфікацыі фактаў і вынікаў Другой сусветнай вайны.

На Гомельшчыне з 1941-га да 1943-га было поўнасцю альбо часткова знішчана звыш 1470 вёсак. Частка населеных пунктаў так і не аднавілася. На тэрыторыі рэгіёна за гады нямецка-фашысцкай акупацыі было расстраляна, павешана і спалена больш за 90 тысяч мірных грамадзян. Для зняволення людзей арганізавана амаль 90 месцаў прымусовага ўтрымання.

СТАР. 3



Пракурор Гомельскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ перадаў архіўныя матэрыялы Рэчыцкаму музею.

Клімат

# ПАЦЯПЛЕННЕ ІДЗЕ, але ў нас у краіне рызыкоўнае земляробства

### А гэта трэба абавязкова ўлічваць

**Ужо некалькі дзесяткаў гадоў на планеце назіраецца глабальнае пацяпленне. І не сакрэт, што змяненне клімату на тэрыторыі Беларусі — частка глабальных тэндэнцый.**

## МЫ «ГРЭЕМСЯ» ХУТЧЭЙ АМАЛЬ У ЧАТЫРЫ РАЗЫ

Па падліках спецыялістаў, пачынаючы з 1976 да 2020 года на тэрыторыі нашай краіны гадавая тэмпература паветра ў сярэднім расце з хуткасцю 0,63 градуса за 10 гадоў. Гэтыя тэмпы росту перавышаюць хуткасць росту тэмпературы паветра па ўсім зямным шары ў 3,5 раза.

Вядома, тэмпы вельмі высокія, але важна адзначыць, што на тэрыторыі ўсіх суседніх краін хуткасць росту блізкая да гэтай, адзначыла **начальнік аддзела вывучэння змяненняў клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу, фонду даных Белгідрамета Наталля КЛЕВЕЦ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2022 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «Мы ў любых складаных выпадках знойдзем сродкі, каб падтрымаць і трэнераў, і спартсменаў»

## «НА ЛЮБОЕ ДЗЕЯННЕ ЁСЦЬ ТАКОЕ Ж СУПРАЦЬДЗЕЯННЕ»

Прэзідэнт заўважыў, што на нарадзе хоча пачуць адказ толькі на адно пытанне. «Мы зрабілі ўсё для таго, каб спартсменам можна было годна выступаць, падрыхтавацца, стварылі ўмовы. Гэта нятанна абышлося нашай дзяржаве. Што ў выніку?» — запытаў Прэзідэнт у міністра спорту і турызму Сяргея Кавальчука і прысутных.

Сяргея Кавальчука кіраўнік краіны папрасіў першым далажыць, куды пайшлі грошы і як спартсмены адказалі на ўвагу з боку дзяржавы. «Тут не час для самасправаздач. Два словы, як вы выступілі. Але практычна ўсе назіралі і бачылі ваш «патрыятызм» і «гераізм». Што будзем рабіць далей? Як будзем развіваць спорт? Ці ўвогуле адмовімся ад яго і будзем займацца фізкультурай?» — пералічыў тэмы для абмеркавання са спартыўнымі функцыянерамі Прэзідэнт.

**Міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** пачаў свой даклад з заўвагі, што падрыхтоўка і ўдзел нашых спартсменаў у спаборніцтвах у апошнія гады праходзілі ва ўмовах беспрэцэдэнтнага ціску.

«Сяргей Міхайлавіч, на любое дзеянне ёсць такое ж супрацьдзеянне. Не трэба казаць, на каго хто ціснe. Душаць усё і ціснуць на ўсіх. А спартсмены і ваенныя на тое і існуюць: як націснулі — так і атрымалі», — адказаў на гэта Прэзідэнт.

Сяргей Кавальчук падкрэсліў, што беларускі спорт сутыкнуўся з новай формай правакавання. І наколькі гэта магчыма, вытрымаў удар. Але не ўсе аказаліся гатовыя да такога ўздзеяння. Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад расійскіх лыжнікаў, на якіх ціснулі не менш, але яны завалявалі больш за ўсіх медалёў. «Лыжныя гонкі: хто на вас так націснуў, што вы паехалі туды са спартсменамі і ні ў адным відзе не ўдзельнічалі? Хто націснуў так, што мы не змаглі ўзяць удзел у гэтых спаборніцтвах? На Расію таксама ціснулі не менш, і такі вынік, як у іх, вам і не сніўся. Пры чым тут ціск? Ціск да лепшага. Калі ціснуць, тады і выступаеш лепш», — заявіў ён.

Міністр звярнуў увагу, што спорт — гэта вялікая палітыка. Сёння вырашаецца пытанне аб правядзенні альтэрнатыўных спаборніцтваў. У прыватнасці, разам з краінамі СНД, ШАС, БРІКС. «Такія мерапрыемствы дадуць магчымасць не толькі папулярызаваць здаровы лад жыцця ў нашай краіне, але і выкарыстоўваць і развіваць спартыўную інфраструктуру ў тым ліку і ў рэгіёнах. Такімі мерапрыемствамі стануць другія гульні краін СНД, якія адбудуцца ў нас у наступным годзе. У спорце не павінна спыняцца жыццё. Важна, каб кожны спартсмен разумеў, што яго інтарэсы не будуць ушчэмленыя», — упэўнены кіраўнік ведамства.

Пасля яго даклада Аляксандр Лукашэнка задаў пытанне: «Дзе станоўчая дынаміка, дзе прагрэс? Вось што мне патрэбна! Я як эканаміст разумею: сёння так было, заўтра рухаемся наперад».

Ён заўважыў, што колькасць медалёў, заваяваных на Алімпійскіх гульнях, пастаянна зніжаецца. «Мы ўклалі вялізныя сродкі. І людзі хочуць бачыць сваіх герояў, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі трэнер не хоча працаваць, папівае каву на трэніроўках, кіне мяч ці лыжы — і бяжыце! Таму і вынік такі».

Асобна кіраўнік дзяржавы выказаў свае нараканні аб развіцці некаторых відаў спорту. «Вы сталі агідна гуляць у хакей! Нацыянальныя віды спорту — футбол і хакей», — заявіў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што памятае ўсе абяцанні чыноўнікаў ад спорту, але прагрэсу не бачыць. І папярэдзіў, што сёння ім не трэба разлічваць на вялікія фінансавыя ўкладанні ў сферу.

## «НА ЖАЛЬ, ПАКУЛЬ УСЁ ІДЗЕ ЎНІЗ»

Пасля з дакладамі выступілі некаторыя з запрошаных чыноўнікаў са спорту. **Кіраўнік беларускай дэлегацыі на Алімпійскіх гульнях у Пекіне, дырэктар РЦАП па зімовых відах спорту «Раўбічы» Аляксандр ГАГІЕЎ** падкрэсліў, што беларусы не былі турыстамі на Алімпіядзе, хоць і не выканалі пастаўленыя задачы. Камусьці не хапіла часу на вывучэнне спартыўных пляцовак, камусьці — адпачынку, а некаторыя аказаліся непадрыхтаванымі да цяжкіх умоў надвор'я.

**Старшыня Беларускай федэрацыі біятлона Андрыян ЦЫБУЛЬСКІ** заявіў, што відавочных пралікаў у падрыхтоўцы да Алімпійскіх гульняў не дапушчана. А галоўнай прычынай не поўнасцю рэалізаванага патэнцыялу ён лічыць адсутнасць дастатковага і, галоўнае, устойлівага вопыту ў пераможных стартах. «Усе спартсмены былі цвёрда арыентаваныя на барацьбу за максімальны вынік, усведамляючы, што могуць змагацца за медалі ў кожнай гонцы. Адсюль залішнія эмоцыі, хваляванне, залімітавая матывацыя, што часам іграе супраць», — растлумачыў ён.

**Былы кіраўнік федэрацыі біятлона Валерый ВАКУЛЬЧЫК** запэўніў, што трэнерскі штаб і кіраўніцтва стараецца зрабіць максімум. Усе настроены на тое, каб беларускія спартсмены не проста ўдзельнічалі, а перамагалі.

«Вы настроены, але, на жаль, пакуль усё ідзе ўніз», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Падрабязна пра выступленне канькабежцаў на галоўных стартах расказаў **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Сяргей МІНІН**. За апошнія гады гэты від спорту ў Беларусі зрабіў вялікі крок наперад, у нацыянальнай камандзе павялічылася колькасць спартсменаў. Ёсць вынікі на міжнародных стартах. У многім гэта стала магчыма дзякуючы з'яўленню ў Мінску сучаснага канькабежнага стадыёна. Беларуская каманда канькабежцаў — адна з самых маладых у свеце. «Дынаміка ў канькабежным спорце станоўчая. Трэба проста якасна і прафесійна рабіць сваю работу. На наступнай Алімпіядзе ў Мілане перспектывы ў нас ёсць», — адзначыў Сяргей Мінін. Галоўны трэнер прапанаваў, як удасканаліць інфраструктуру для развіцця канькабежнага спорту, расказаў пра неабходнасць будаўніцтва спартыўных аб'ектаў у рэгіёнах.

Аляксандр Лукашэнка правёў паралель з хакеем, для развіцця якога былі пабудаваны дзясяткі лядовых пляцовак, а вынікі засталіся невысокімі. Таму канькабежнаму спорту не варта разлічваць на з'яўленне буйных аб'ектаў. Кіраўнік дзяржавы заклікаў эфектыўна задзейнічаць тое, што ўжо ёсць, і прапанаваў так выбудаваць трэніровачны працэс, каб самыя перспектыўныя спартсмены займаліся ў Мінску.

«Не разлічвайце, што мы вам у найбліжэйшы час пабудуем канькабежны стадыён. Бярыце лыжаролеры і пачынайце працаваць са спартсменамі. Павінна быць методыка, фізічная падрыхтоўка», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

## «ТАК ДАЛЕЙ БЫЦЬ НЕ МОЖА»

Прэзідэнт заклікаў узяць пад кантроль работу ў спартыўных школах па ўсіх відах спорту. Кантраляваць іх павінна Мінспорту і профільныя федэрацыі. Па словах кіраўніка краіны, новаму пакаленню атлетаў не хапае духу і волі.

«А дух — гэта і на спартыўных пляцоўках. Мы Домрачавай ганарымся. Дык яна напалову ці на чвэрць не наша. Ці Лобастаў (Мікіта, біятланіст. — **«Зв.»**). Ён адкуль? З Расіі. А ён наступны пасля Смольскага ідзе. А нашы што, не такія? Такія. Але лайдакі разам з трэнерамі сваімі», — крытыкаваў Прэзідэнт.

У краіне, адзначыў ён, вызначаны тры чалавекі з улады, адказныя за спорт, — віцэ-прэ'мер, міністр спорту і кіраўнік НАК. Ад заканадаўчай улады кантраляваць сферу назначаны сенатар Дзмітрый Баскаў.

«Збярыцеся ўтраіх, прарэвізуйце ўсё. Не толькі ў зімовых відах спорту. Паглядзіце на кіраўнікоў федэрацый, трэнерскі склад... Калі 80-гадовы стары хоча вярнуцца і дапамагчы падрыхтаваць спартсмена, вярніце яго. Павыкідвайце лайдакоў. Мы трацім вялікія грошы на трэнераў, якія нічога не робяць», — абураўся Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў пра рэспубліканскі турнір сярод юніёраў, які прайшоў некалькі тыдняў таму ў Раўбічах. Ён падзяліўся сваім меркаваннем, што там хлопцы і дзяўчаты паказалі добрую тэхнічную і фізічную падрыхтоўку. «Яны ёсць, бяры ды працуй з імі», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка трэнераў.

Выступленне нашай каманды на зімняй Алімпіядзе Прэзідэнт назваў «нікчэмным». «Мы чатыры гады правалілі. Вы з'елі дзяржаўныя грошы проста так. Вынік адзін — так далей быць не можа. Задачы я вам пастаўлю: тройка плюс Баскаў, збірайцеся. Правядзіце рэвізію», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт чарговы раз акцэнтаваў, што ў спорце важны перш за ўсё вынік. І яго хоча бачыць і Прэзідэнт, і ўсе беларусы. Ён заўважае, што таксама трэба вызначыцца, як развіваць спорт і алімпійскі рух у новых рэаліях — варожых адносін да Беларусі і Расіі з боку МАК і шэрагу міжнародных федэрацый.

«Ёсць нам з нашым узроўнем дзе выступаць і з кім спаборнічаць, — мяркуе Прэзідэнт. — Давайце паб'ём нашых старэйшых братоў. Давайце ў расіян выйграем усе спаборніцтвы. Мы ж у адной лодцы сёння».

Кіраўнік краіны задаў спартыўным чыноўнікам яшчэ адно пытанне: чаму яны не звярнуліся ў міжнародныя суды, каб апратэставаць «неспартыўныя» рашэнні, абмежаванні камітэтаў у дачыненні да айчынных атлетаў і паралімпійцаў?

«Інваліды перад кім правініліся? Вы павінны гвалтам крычаць, ва ўсе званы біць, у тым ліку ў міжнародных судах. Ды вы звярніцеся ў міжнародны суд, каб гэта гучала і спартсмены бачылі, што вы гатовы іх абараняць», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна пракаментаваў ён выступленні хакейнай зборнай, якая нават не трапіла на Алімпійскія гульні. «Радавацца трэба, што нашы выступаюць у НХЛ, КХЛ і іншых камандах. Але ім трэба сабрацца і вывесці зборную хоць бы на Алімпіяду, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Што казаць увогуле пра хакей? Гэта мярзотная гульня. Няма духу».

## «БУДЗЕ ВЫНІК — БУДЗЕМ ПЛАЦІЦЬ»

Дзяржава стварыла ўсе ўмовы для заняцця спортам і гатова плаціць грошы за вынікі на Алімпіядзе, сказаў Прэзідэнт. Але асноўную праблему паражэнняў ён бачыць у наступным: «Няма, як вы самі кажаце, бляску ў вачах, няма волі да перамогі».

Па яго словах, ціск на атлетаў з боку міжнароднай супольнасці — шанц для спорту, як санкцыі для эканомікі. «Калі на цябе ціснуць, ты павінен працівіцца. Калі не працівішся, тады няма чаго ў спорт ісці, ты — нішто», — выказаў думку Прэзідэнт.

Ён паставіў чарговае заданне для чыноўнікаў — працаваць над тым, дзе нашы атлеты будуць спаборнічаць і што будуць ад гэтага мець. Але Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў: не трэба арыентаваць спартсменаў на «мільённыя» заробкі. Іх не будзе.

«Грошы павінны быць зароблены. Будзе вынік — будзем плаціць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Асноўнае патрабаванне да спартсменаў акрамя вынікаў — быць патрыётам і грамадзянінам сваёй краіны. «Калі вы хочаце працаваць — працуйце. Не? Прасіцеся за мяжу. Я вас нікога трымаць не буду. Хочаце працаваць — арганізоўвайце працэс, пачынаючы ад школ і выдавайце на-гара Смольскіх, Домрачавых», — заявіў Прэзідэнт.

Ён пералічыў асноўныя характарыстыкі, якія павінны быць у сапраўднага спартсмена і пераможца. І, на думку кіраўніка краіны, гэта зусім не талент. «Не глядзіце на яго талент. З яго толку не будзе, калі ён не гарыць, калі ў яго ўнутры няма стрыжня. Што я вам гэта расказваю? Вы, трэнеры, лепш за мяне ведаеце. Усе — былыя спартсмены. Вы ведаеце, што рабіць. У адваротным выпадку вы працаваць не будзеце», — адзначыў кіраўнік краіны.

Толькі пры наяўнасці вынікаў у іх падапечных яны будуць у пашане і займеюць матэрыяльны дабрабыт, нават пры нестабільнай эканамічнай сітуацыі. «Мы ў любых складаных выпадках знойдзем сродкі, каб падтрымаць і трэнераў, і спартсменаў. Калі вы не хочаце, у вас ёсць шанц адысці ўбок. Гэта я казаў у 2020 годзе напярэдадні выбараў: «Не здраджвайце, не перашкаджайце, сыдзіце ўбок, і вам нічога не будзе», — нагадаў свае словы Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, сёння ў Еўропе вельмі напружаная сітуацыя. Адна іскра — і рэгіён запалае. «Таму неабходна кожнаму на сваім месцы сабрацца і выдаць вынік», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## «ЧАПЛЯЦЦА ЗУБАМІ ЗА КРАІНУ»

У ранейшыя часы спорт быў нагодай для спынення разнастайных палітычных рознагалоссяў, а зараз ён, як і эканоміка, непарыўна звязаны з палітыкай. Таму нядзіўна, што на нарадзе Прэзідэнт выказаўся і наконт апошніх міжнародных навін.

Так, ён пракаментаваў прапанову Польшчы па накіраванні ва Украіну заходняга міратворчага кантынгенту. «Вы ж бачыце, ачмурэлыя гэтыя палякі, яны ўжо прапануюць (гэтага запрасілі з-за акіяна, і яму пачынаюць шпігаваць (гаворка аб прэзідэнце ЗША Джо Байдэне. — **«Зв.»**)): давайце створым міратворчыя сілы, тысяч сто, і ўвядзём праз Львоў ва Украіну. Вы разумееце, што гэта трэцяя сусветная вайна», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Па яго словах, пры такім раскладзе Беларусі не атрымаецца застацца ўбаку.

«Нас проста ботам растопчуць з вашым такім характарам, мы нават не паспеем піскнуць! Ці вы думаеце, я зноў буду з аўтаматам наперадзе бегаць? Не, хлопцы. Хочаце мець краіну — за яе трэба чапляцца зубамі і трымацца. Лепш без аўтамата. Таму сітуацыя вельмі сур'ёзная, вельмі напружаная. І мы гэта павінны бачыць і разумець», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама ён выказаўся аб прадстаўніках Украіны, якія шпіёнілі ў Беларусі, карыстаючыся дыпламатычным прыкрыццём. «Міжнародных гэтых шпіёнаў... цэлая кодла, нават у нашай Украіне там. Мы ж іх бачылі — 12 чалавек. Ездзіце, глядзіце. Не, трэба было шпіёніць, яшчэ і паскудзіць у Беларусі. Ну вось зараз выкінулі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПАМЯЦЬ ЯК ПАПЯРЭДЖАННЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы не маем права забыць тое, што адбылося, перакананы **пракурор Гомельскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ**:

— У гісторыі нашага народа падзеі ваеннага часу па-ранейшаму займаюць важнае месца. Да сёння адкрываюцца новыя даныя аб трагедыях тых гадоў, зверствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у дачыненні да мірнага насельніцтва. Летась, калі Генеральная пракуратура распачала крымінальную справу па факце генацыду насельніцтва Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд, ужо першыя раскопкі на тэрыторыі вобласці адкрылі жудасныя сведчанні выпадкаў масавага знішчэння мірных жыхароў.

Падчас раскопак на тэрыторыі Гомельскага раёна было знойдзена шмат бытавых рэчаў, якія сведчаць аб расстрэлах менавіта мірных грамадзян. Знойдзены кулі і гільзы, якія, як устаноўлена балістычнай экспертызай, выпушчаны з нямецкай зброі. Частка артэфактаў перададзена пракуратурай у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і музей Гомельскага палацава-паркавага ансамбля.

## «БЫВАЙЦЕ, ЛЮДЗІ...»

Дзякуючы падтрымцы абласной пракуратуры на Гомельшчыне нарадзіўся ўнікальны выставачны праект «Бывайце, людзі...». У экспазіцыі прадстаўлены не толькі рэчы тых, хто загінуў ад рук акупантаў і іх памагатых, але і ўспаміны сведкаў і пацярпелых, паказанні карнікаў. Можна ўбачыць аэрафотаздымкі нацысцкай разведкі, зробленыя за дзень да ўзяцця нямецкай арміяй Гомеля, а таксама кадры з раскопак масавых пахаванняў. Сярод экспанатаў — арыгінальны здымак працэсу пакарання мірных жыхароў у Гомелі, зроблены нямецкім фотааматарам. Ёсць і рэчы з раскопак у межах следства ў Чонкаўскім лесе ў 2021 годзе. Экспазіцыя «Бывайце, людзі...» аб'ездзе музеі ўсіх раённых цэнтраў Гомельшчыны.

## НОВЫЯ ФАКТЫ

Асабліва цэнныя экспанаты, знойдзеныя ў месцах масавых пахаванняў, супрацоўнікі Гомельскай абласной і раённай пракуратуры перадалі некалькім гісторыка-краязнаўчым музеям Гомельскага раёна. Экспазіцыю гісторыка-краязнаўчага музея Красненскай сярэдняй школы папоўнілі арыгіналы аэрафотаздымкаў нямецкай ваеннай разведкі лета 1941 года.

Напачатку вайны вёска Краснае і яе ваколле сталі месцам масавай расправы гітлераўцаў над мірнымі жыхарамі і ваеннапалоннымі канцлагера Дулаг-121. Доўгі час вяліся пошукі вялізнай брацкай магілы на тэрыторыі населенага пункта. Але толькі два гады таму ўдалося ўстанавіць дакладныя каардынаты супрацьтанкавага рову, дзе і праводзілі расстрэлы людзей. Устанавілі месца расправы дзякуючы копіі аэрафотаздымка, зробленага нямецкай разведкай летам 1941-га. Фота захоўвалася ў архіве ў ЗША.

— Сёння падчас крымінальнага працэсу адкрываюцца новыя факты і фіксіруюцца сведчанні відавочцаў тых падзей, а таксама нашчадкаў, чые блізкія сталі ахвярамі нацыстаў. Пасля іх дбайнага даследавання будуць устаноўлены і іншыя месцы масавай гібелі мірных савецкіх грамадзян, — упэўнены Віктар Марозаў.



Стэнд з дакументамі і фатаграфіямі, якія распавядаюць аб выяўленні месца масавага расстрэлу мірных жыхароў у Чонкаўскім лесе і правядзенні раскопак, супрацоўнікі абласной і раённай пракуратуры перадалі Чонкаўскай базавай школе.

— Пошукавыя работы, якія праводзіліся летась на тэрыторыі Чонкаўскага лясніцтва, выявілі найбуйнейшае на Гомельшчыне пахаванне астанкаў ахвяр нацысцкіх злачынстваў. Прычым усе факты сведчаць, што ў лясным масіве былі расстраляны менавіта мірныя грамадзяне — жанчыны і састарэлыя людзі, — звяртае ўвагу пракурор.

На дадзены момант работнікамі пракуратуры па справе аб генацыдзе апытана звыш 2690 чалавек: з іх 1692 — былыя малалетнія вязні фашысцкіх канцлагераў. Устаноўлена 132 раней невядомых месцы масавых расстрэлаў і пахаванняў мірных жыхароў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

На тэрыторыі Гомельскага раёна гэта не толькі тэрыторыя ў Чонкаўскім лясніцтве, але і пахаванні каля пасёлка Красны Багатыр, вёскі Паддабранка, участкі, прылеглыя да былых перасыльных лагераў у Прыбытках і Кантакузаўцы.

— Сёння знаходзіцца нямала жадаючых сказіць старонкі ваеннай гісторыі. Нагадаю хоць бы пра настойлівае імкненне некаторых інтэрнэт-рэсурсаў прыпісаць расстраляных на тэрыторыі Чонкаўскага лясніцтва да ахвяр сталінскіх рэпрэсій. У той жа час як усё сведчыць аб тым, што людзі загінулі ад рук фашысцкіх акупантаў, — падкрэслівае суразмоўнік. — Таму Закон «Аб генацыдзе беларускага народа» асабліва актуальны. Ён заклікаты не дапусціць скажэння гістарычнай праўды і вынікаў Вялікай Айчыннай вайны, захаваць памяць як аб гераічных, так і аб трагічных старонках гісторыі.

## «ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ»

Унікальныя экспанаты для папаўнення тэматычных экспазіцый Рэчыцкаму краязнаўчаму музею асабіста перадаў пракурор Гомельскай вобласці Віктар Марозаў. Перададзены рэдкія карты Рэчыцы і Рэчыцкага раёна 1938 года, а таксама артэфакты, якія сведчаць аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя і многія іншыя каштоўныя музейныя матэрыялы былі выяўлены дзякуючы актыўнаму ўзаемадзеянню пракуратуры і дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці.

З базы звестак наконт спаленых вёсак Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, размешчанай на сайце нацыянальнага архіва, можна даведацца, што толькі на тэрыторыі Рэчыцкага раёна фашысты і іх памагатыя спалілі 68 населеных пунктаў. Работнікі пракуратуры вобласці і супрацоўнікі архіваў выявілі чатыры ўнікальныя карты рэчыцкай мясцовасці, алічбавалі іх, а на адну з картаў нанеслі ўсе спаленыя вёскі раёна.

— Папаўненне дзеючых экспазіцый музеяў падобнымі каштоўнымі экспанатамі і стварэнне новых выстаў даюць магчымасць больш глыбока азнаёміцца з фактамі і доказамі генацыду беларускага народа ў гады вайны. Гэта, безумоўна, дапамагае грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню падрастаючага пакалення, захаванню гістарычнай памяці аб тых страшных падзеях, — упэўнены Віктар Марозаў.

Пракурор вобласці адзначыў, што ў экспазіцыю Рэчыцкага краязнаўчага музея перададзены і матэрыялы, сабраныя для праекта пракуратуры Гомельскай вобласці і газеты «Гомельская праўда» — «Генацыд не мае тэрміну даўнасці» — аб жудасных старонках ваеннай гісторыі Рэчыцкага раёна. У буклеце прадстаўлены ў тым ліку ўласныя даследчыя артыкулы пракурора Гомельскай вобласці. Віктар Мікалаевіч сам — ураджэнец Рэчыцкага раёна, выпускнік Салтанаўскай сярэдняй школы 1977 года.

— Апублікаваны і цыкл новых матэрыялаў аб жудаснай трагедыі 1943 года, калі разам з жыхарамі была знішчана вёска Кабылёва Рэчыцкага раёна (цяпер Першамайск). У межах расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа пракуратурай вобласці былі даследаваны архіўныя матэрыялы аб трагедыі гэтага населенага пункта. Старонкі іх пажаўцелі за 78 гадоў, але не страцілі свайго гістарычнага значэння. На жаль, сёння аб ёй многія нічога не ведаюць. Значыцца Кабылёва далёка не ва ўсіх спісах спаленых вёсак Беларусі, — адзначае Віктар Марозаў.

У буклеце, перададзеным пракурорам вобласці ў Рэчыцкі краязнаўчы музей, прадстаўлены дакладныя цытаты паказанняў відавочцаў, якія цудам засталіся жывымі падчас карнай аперацыі ў Кабылёве.

— Вядома, што большасць людзей згарэла зажыва. Усяго немцы 14 мая 1943 года расстралялі і спалілі 1050 чалавек. Выратаваліся толькі дзесяць. Сярод знішчаных у Кабылёве: каля 300 мужчын, столькі ж жанчын, больш за 400 дзяцей. Памяць аб выпаленай зямлі, дзе загінула столькі невінаватых людзей, — упэўнены Віктар Мікалаевіч, — павінна жыць і надалей.

З архіўных матэрыялаў вядома таксама, што ў лістападзе 1943 года, калі Чырвоная Армія вызваліла цэнтр воласці, вёску Маканавічы Васілевіцкага раёна, — пачаўся пошук паплечнікаў фашыстаў. Значную дапамогу следству аказалі партызаны атрада «Мсціўца» Рэчыцкага злучэння. Былі затрыманы былы бургамістр воласці і староста вёскі Кабылёва. Памагатыя акупантаў не прызнаваліся ва ўдзеле ў расстрэлах і спальванні зажыва мірных жыхароў, але знайшліся сведкі іх злачынстваў.

Налета з дня малавядомай трагедыі спаленай вёскі споўніцца 80 гадоў. Сёння разглядаецца магчымасць правядзення рэканструкцыі існуючага мемарыяла ахвярам фашызму ў вёсцы Першамайск (раней Кабылёва) Рэчыцкага раёна і стварэння маршруту памяці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота пракуратуры Гомельскай вобласці і БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Два мільярды чалавек вымушаныя спажываць забруджаную ваду



Аб гэтым заявіў прэзідэнт Сенегала, старшыня Афрыканскага саюза Макі Сал на IX Сусветным водным форуме, паведамляе ТАСС са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва Agence de Presse Senegalaise. На думку Макі Сала, варта «біць трывогу аб сур'ёзнасці сітуацыі, звязанай з недахопам вады. Каб пытанні, звязаныя з вадой, заставаліся ў цэнтры ўвагі міжнароднага парадку дня, бо гэта пытанне жыцця і здароўя для мільярдаў людзей ва ўсім свеце. Але таксама і пытанне захавання міжнароднага міру і бяспекі». Як адзначыў старшыня Афрыканскага саюза, праз 25 гадоў пасля правядзення першага Сусветнага воднага форуму ў Маракешы праблемы недахопу рэсурсаў і дэградацыі навакольнага асяроддзя працягваюць пагаршацца. «Цяперашняя сітуацыя выглядае несуцяшальнай. Двое з пяці чалавек у свеце жывуць у раёнах з дэфіцытам вады. Пры гэтым 80 працэнтаў вады скідваецца ў прыроду без ачысткі, што ставіць пад пагрозу здароўе і жыццё 4,5 мільярда чалавек», — заявіў ён.

## У Фінляндыі могуць спыніць выпуск газет з-за дэфіцыту паперы

Пра гэта заявіў выканаўчы дырэктар Саюза медыя Юка Холмберг, паведаміў партал Yle. Праблема абумоўлена дысбалансам попыту і прапановы, а таксама працяглай забастоўкай работнікаў цэлюлозна-папяровага прадпрыемства UPM. Да пачатку страйку прыкладна 20 працэнтаў фінскіх газет друкавалася на расійскай паперы, але пасля ўвядзення санкцый імпарт паперы з Расіі спыніўся. Летась на еўрапейскім рынку газетная папера каштавала 390 еўра за тону, цяпер цана павысілася да 670 еўра. Яна выпрацоўваецца ў Фінляндыі толькі на заводзе UPM у Ямсянкасkі.

## У Атакамскай упадзіне Ціхага акіяна знайшлі невядомых істот

Чылійскія навукоўцы здзейснілі апусканне ў Атакамскую ўпадзіну на глыбіню ў восем кіламетраў. Там яны ўбачылі істот, якія могуць адносіцца да зусім новых для навукі відаў, паведаміў «МИР24». На глыбіні больш за 100 метраў навукоўцы ўбачылі незвычайныя геалагічныя структуры, а таксама іх насельнікаў. Яны заўважылі галатурый, ці напаўпразрыстых марскіх агуркоў, падобных на жэле. Верагодна, гэты від раней не быў ідэнтыфікаваны. Даследчыкі выявілі мікробныя супольнасці, аб існаванні якіх тут раней не падазравалі. Як вядома, Атакамская ўпадзіна (Чылійскі жолаб) размяшчаецца на стыку двух тэктанічных пліт — Паўднёва-Амерыканскай і Наска. Раней у яе не спускаўся ніводны чалавек. Усе даследаванні праводзіліся з дапамогай беспілотных апаратаў, якімі кіравалі дыстанцыйна.

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні аб праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 26 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Міхайлавіч СУБОЦІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Ну і ну!

# ВЕЛАСІПЕД ЗА... ТРЫ РУБЛІ

**Мінчанін паведаміў у міліцыю інфармацыю аб тым, што на вуліцы з рук усяго за тры рублі набыў у падазронага мужчыны ровар.**

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС Мінска правялі праверку і ўстанавілі, што гэты веласіпед напярэдадні быў украдзены з пад'езда шматкватэрнага дома ў сталіцы. Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, транспарт коштам каля 300 рублёў не быў прышпілены. Дзеля грошай на спіртное яго ўкраў і прадаў 62-гадовы мінчанін. Па факце крадзяжу распачата крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПАЦЯПЛЕННЕ ІДЗЕ,

## але ў нас у краіне рызыкоўнае земляробства

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

На яе думку, калі казаць пра СНД, то на тэрыторыі Беларусі тэмпы росту тэмператур самыя высокія. Гэта ў першую чаргу звязана з нашай невялікай тэрытарыяльнай працягласцю, лічыць спецыяліст.

Варта адзначыць, што на працягу года тэмпы трэнду на пацяпленне вельмі розныя. Найбольшая хуткасць росту тэмпературы паветра характэрная для восеньскага і летняга сезонаў, а найменшая — для зімовага. «У гадавым разрэзе на працягу практычна ўсіх месяцаў тэмпература паветра вышэйшая за норму, за выключэннем мая», — дадала прадстаўнік Белгідрамета. Май у нашай краіне можа быць як вельмі гарачым, так і вельмі халодным з мінімальнымі начнымі тэмпературамі (замаразкамі).



Што датычыцца ападкаў, кліматолагі не адзначаюць значнай тэндэнцыі да змены іх гадавой колькасці. Але адзначаецца змена ўнутры — і размеркавання ападкаў па сезонах і па месяцах. Апошнім часам у нас пераважае сухі верасень, недахоп ападкаў у першыя вясновыя месяцы, а таксама супермоцныя дажджы ў сярэдзіне лета.

### ЭКСТРЭМАЛЬНАСЦЬ НАДВОР'Я ТОЛЬКІ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Сельскагаспадарчая вытворчасць узаемадзейнічае са складанай сістэмай прыродных умоў, з ліку якіх клімат і надвор'е з'яўляюцца самымі дынамічнымі і актыўнымі, паведаміла **начальнік службы гідралогіі і агpаметэаралогіі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Кацярына ІСТОМІНА**.

На яе думку, змяненне клімату мае як пазітыўны, так і негатыўны ўплыў на расліны. Нягледзячы на гэта, наша краіна ўсё роўна застаецца зонай досыць рызыкоўнага земляробства.

Якімі б ні былі цёплымі першыя вясновыя месяцы, у маі па-ранейшаму даволі часта адзначаюцца замаразкі. Хоць зімы ў цэлым прыкметна пацяплелі, зімовы перыяд скараціўся, што спрыяльна для перазімоўкі раслін, пладовых дрэў і кустоў, але маразы да дваццаці градусаў і ніжэй здараюцца, як і раней. Пры гэтым снежнае покрыва няўстойлівае. Рызыкі пашкоджання зімуючых культур ад перападаў тэмператур (вяртання халадоў) захоўваюцца. Вегетацыйны перыяд таксама стаў цяплейшы, палепшылася цеплазабеспячэнне раслін. Але пры гэтым узмацняецца экстрэмальнасць клімату за кошт росту максімальных тэмператур паветра, павелічэння колькасці спякотных дзён, нарастае паўтаральнасць засух і засушлівых з'яў.

Змяненне клімату, павелічэнне экстрэмальнасці ўмоў надвор'я, якое мы назіраем, патрабуе рэгулярнай ацэнкі агракліматычных рэсурсаў на тэрыторыі краіны, перагляду шматгадовых паказчыкаў. Гэта адзін з кірункаў, якому ў апошнія гады агpаметэаролагі ўдзяляюць асаблівую ўвагу.

У Белгідрамеце выканана навукова-даследчая работа «Ацэнка агракліматычных рэсурсаў тэрыторыі Беларусі за перыяд пацяплення», дзе прадстаўлены асноўныя агракліматычныя паказчыкі, характэрныя для сучаснага клімату. У прыватнасці, распрацаваны і ўкаранёны для выкарыстання навукова-прыкладны даведнік па агракліматычных рэсурсах Беларусі на аснове ацэнкі сучасных змяненняў клімату за 1989—2018 гады.

### БУЛЬБУ ЛЕПШ САДЗІЦЬ КРЫХУ РАНЕЙ

Па словах Кацярыны Істомінай, пераглядаецца набор сельгаскультур, якія вырошчваюцца ў Беларусі. Спецыялісты выводзяць новыя сарты збожжавых, кукурузы, бульбы. Дарэчы, цяпер краіна пераходзіць больш на пасадку ранняй бульбы для таго, каб захапіць ранні вясновы і летні перыяды, калі запасы вільгаці яшчэ дастатковыя і тэмпература паветра не вельмі высокая, і сабраць першы ўраджай. У заходніх і паўднёвых рэгіёнах гэта ўжо практыкуецца не першы год.

Прадстаўнік Белгідрамета адзначыла, што засухі ў краіне паўтараюцца практычна штогод, асабліва пакутуюць Гомельская і частка Брэсцкай абласцей. «Што датычыцца такой гістарычнай для нас культуры, як лён, у сувязі са змяненнем клімату яе плошчаў застаецца ўсё менш. Затое з'яўляюцца нехарактэрныя для нашай тэрыторыі культуры: вінаград, персікі, абрыкосы і нават кавуны», — дадала яна.

Кацярына Істоміна адзначыла, што пад уплывам змяненняў клімату сельскагаспадарчая вытворчасць усё больш мяняецца. Аграрыі адаптуюцца да новых умоў. Аграметэаролагі даюць ім неабходныя рэкамендацыі па доглядзе сельгаскультур.

### АЗІМЫ РАПС — КУЛЬТУРА ДАЛІКАТНАЯ

Перазімоўка сельскагаспадарчых культур сёлета праходзіла ва ўмовах перавагі адліжнага надвор'я. У той жа час у першы зімовы месяц на тэрыторыі краіны назіраўся даволі кантрасны тэмпературны рэжым, мелі месца затокі халодных паветраных мас, распавядае Кацярына Істоміна. У найбольш халодныя ночы тэмпература паветра паніжалася да мінус 14 і нават мінус 19 градусаў, ва ўсходняй частцы краіны і месцамі ў Віцебскай вобласці паветра ахаладжваецца да мінус 24 градусаў.

Тэмпература глебы на глыбіні залягання вузла кушчэння азімых збожжавых на працягу зімы ў асноўным была павышанай, што стварала перадумовы для больш інтэнсіўнага расходу раслінамі пажыўных рэчываў і іх паслаблення. У першую чаргу гэта датычыцца паўночна-ўсходняй паловы Беларусі, дзе працяглы час захоўвалася снежнае покрыва.

Для ацэнкі жыццяздольнасці азімых культур падраздзяленні Белгідрамета двойчы правялі іх адрошчванне: у канцы студзеня і ў канцы лютага. Вынікі паказалі, што на большасці назіраных палёў азімыя збожжавыя культуры валодаюць нармальнай жыццяздольнасцю — у адабраных узорах назіралася поўнае адрастанне або парэджанасць не перавысіла натуральную гібель. Крыху павышаная парэджанасць пшаніцы і трыцікале адзначана ў адзінкавых пробах у Віцебскай і Гомельскай абласцях.

Да пачатку сакавіка на большай тэрыторыі краіны снежнае покрыва на палях сышло. Але з другой пяцідзёнкі сакавіка ўсталяваўся паніжаны тэмпературны рэжым. У самыя халодныя ночы ў многіх раёнах нашага рэгіёна пры адсутнасці снежнага покрыва тэмпература паветра паніжалася да мінус 13 градусаў. Месцамі ў паўночнай частцы і на ўсходзе краіны паветра ахаладжвалася нават да 15 марозу (метэастанцыя Езярышча — мінус 20 градусаў), тут на палях яшчэ захоўваецца снежны полаг вышынёй ад 4 сантыметраў да 13 сантыметраў.

Па назіраннях спецыялістаў аграметэаралогаў, аднаўлення вегетацыі азімых культур да моманту пахаладання яшчэ не было. Таму нізкія тэмпературы ў сакавіку не павінны выклікаць пашкоджанняў збожжавых культур. Тэмпература глебы на глыбіні вузла кушчэння да небяспечных значэнняў не паніжалася — у найбольш халодныя ночы была мінус 3 — мінус 8 градусаў.

### НЕАБХОДНА ПРАВЕСЦІ ЯРАВУЮ СЯЎБУ Ў МАКСІМАЛЬНА СЦІСНУТЫЯ ТЭРМІНЫ

У цэлым перазімоўка збожжавых культур прайшла добра. Менш за 10 % плошчаў неабходна перасяваць — гэта сярэднія шматгадовыя паказчыкі, гэта нармальна.

Аднак, улічваючы, што азімыя збожжавыя культуры сыходзілі ў зіму ў менш развітым стане, чым звычайна (на значных плошчах да моманту спынення вегетацыі не дасягнулі фазы «кушчэння»), у ранні веснавы перыяд ім, як ніколі, неабходны своечасовы і пільны догляд, лічыць начальнік службы.

Для азімага рапсу, як найбольш адчувальнай культуры да перападаў тэмпературы, у сакавіку ўмовы пагоршыліся — месцамі магчымы пашкоджанні гэтай культуры з-за нізкіх тэмператур.

Сакавіцкае пахаладанне зрушыла пачатак вегетацыі азімых культур і сяўбу яравых на пазнейшыя тэрміны. Пры гэтым ва ўмовах перавагі сонечнага з дэфіцытам ападкаў надвор'я назіралася страта глебавай вільгаці.

У аграметэаралагічнай абстаноўцы вельмі важна не ўпусціць аптымальныя тэрміны сяўбы яравых культур і правесці яе ў максімальна сціснутыя тэрміны. Пры апрацоўцы глебы неабходна прымяненне вільгацезберагальных тэхналогій, правядзенне агратэхнічных мерапрыемстваў па закрыцці глебавай вільгаці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# АТЛАНТЫКА ПРЫНЯСЕ НАМ СНЕГ З ДАЖДЖОМ

## Няўжо нам зноў прыйдзецца даставаць цёплую вопратку?

**Сакавік каварны, і ў апошні тыдзень ён спяшаецца нагадаць, што ў нашых шыротах гэта яшчэ амаль зімовы месяц. У чацвер паветраныя масы з Паўночнай Атлантыкі прынеслі шмат аблокаў і ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу раніцай і ўдзень пройдзе кароткачасовы дождж, па паўночным усходзе з мокрым снегам. У многіх раёнах будзе ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, а ўдзень — ад 6 да 13 градусаў са знакам плюс, па поўдні будзе да 16 цяпла.

У нядзелю ўначы і раніцай пераважна па ўсходняй палове краіны будзе кароткачасовы снег, мокры снег, узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. На асобных участках дарог галалёдзіца. Удзень без істотных ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, а ўдзень дасягне 2—9 цяпла, але па паўночным усходзе будзе каля нуля градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, няўстойлівы характар надвор'я захаваецца і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, узмацненне ветру парывамі да 15—22 м/с. Тэмпература паветра ў начны час сутак складзе ад мінус 3 градусаў па паўночным усходзе да плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе. Удзень тэмпература паветра будзе складаць 8—15 цяпла, па поўначы — ад плюс 5 да плюс 7 градусаў.

Патрывожыць нас снег з дажджом і ў аўторак. Уначы і раніцай месцамі магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў. Уначы па поўначы тэмпература будзе да мінус 5 градусаў, а ў дзень па поўдні да плюс 7 градусаў.

У сераду месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ў начны час сутак складзе ад мінус 6 градусаў да плюс 1, месцамі па поўначы — да мінус 8 градусаў. Удзень тэмпература паветра ад 0 да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:

АГРОНОМ, ЗООТЕХНИК

**Требования:** высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

Предлагаем:

- Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- Трудоустройство согласно ТК РБ.
- Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
- Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
- Возмещение расходов по найму жилого помещения.
- Система мотивации получения результатов труда.
- Корпоративная безлимитная мобильная связь.
- Социальный пакет согласно коллективного договора.

Контакты:

Резюме отправлять на e-mail: **mp@rodanagro.com**

тел. **+375 (33) 399-38-60**
**+375 (29) 318-22-65**
(отдел кадров)

УНП 592000776

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:

ТРАКТОРИСТ-МАШИНИСТ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА

**Требования:** опыт работы на энергонасыщенных тракторах, дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

Предлагаем:

- Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- Трудоустройство согласно ТК РБ.
- Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
- Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
- Возмещение расходов по найму жилого помещения.
- Система мотивации получения результатов труда.
- Корпоративная безлимитная мобильная связь.
- Социальный пакет согласно коллективного договора.

Контакты:

Резюме отправлять на e-mail: **wp@rodanagro.com**

тел. **+375 (29) 935-70-20**
**+375 (29) 318-22-65**
(отдел кадров)

УНП 592000776

Кінасеанс

# КЛАСІКА І ДРАМА

**На выхадных на канале «Культура» можна будзе паглядзець кранальную кінагісторыю пра бацькоўскую любоў і няспраўджаныя надзеі. Тут пакажуць савецкі мастацкі тэлефільм «Станцыйны наглядчык», які знялі ў 1972 годзе па аднайменнай аповесці Аляксандра Пушкіна.**



...Самсон Вырын жыве са сваёй дачкой Дуняй спакойна і ўпарадкавана, а пасля з'яўляецца гусар Мінскі. Пачынаецца гісторыя кахання, якая ў фінале зробіць няшчаснымі і дзяўчыну, і яе бацьку. Тут у кожнага персанажа свая драма, свае ўчынкі і выбары з іх наступствамі. А для аўдыторыі гэта добрая нагода не толькі згадаць класічны сюжэт, але і падумаць пра ўласныя жыццёвыя каштоўнасці. У фільме таксама гучаць тры рамансы Аляксандра Пушкіна «Я еxаў да Вас», «Не пытай, навошта», «Дарожныя скаргі» ў выкананні Валянціна Ермакова. Трэба адзначыць, што фільм Сяргея Салаўёва — не першая спроба экранізаваць твор Пушкіна, аднак ці шукаць іншыя версіі, каб параўнаць, і ці глядзець іх — вырашаць вам.

А кінастужку, знятую паўстагоддзя таму, зможаце ўбачыць у суботу раніцай альбо ў нядзелю ў вячэрнім эфіры.

**Алена ДРАПКО.**



# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 142

Задача Аляксандра Варыцкага з Брэста атрымала пахвальны водгук на конкурсе часопіса «Шахматная кампазіцыя» ***(гл. дыяграму)***.




**Белыя:** Кpe1, Фb5, Лd1, Лd8, Cg5, Ch7, Kd4, Kg2, пс2 (9).

**Чорныя:** Кpe5, Cb3, Cb4, Kd5, пп. b7, c3, e6, f4, g4 (9).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Да ўвагі чытачоў — яшчэ дзве партыі нядаўніх чэмпіянатаў Беларусі ў вышэйшай лізе.

Ігар Люцко — Максім Царук. 1. c4 Kf6 2. Kc3 e5 3. Kf3 Kc6 4. e3 d5 5. cd K:d5 6. Фc2 K:c3 7. bc Cd6 8. h4 h6 9. Cd3 Фd7 10. h5 0-0 11. Kh4 Ke7 12. e4 c5 13. a4 b6 14. Cc4 Фg4 15. d3 Ф:h5 16. f3 Kg6 17. g4 Ф:h4+ 18. Л:h4 K:h4 19. Kpf2 Ce6 20. Фb3 C:c4 21. Ф:c4 g5 22. a5 Лae8 23. ab ab 24. Лa6 Cc7 25. d4 ed 26. cd cd 27. Ca3 Лc8 28. Фb3 Лfd8 29. Ce7 Лd7 30. Cf6 Cf4 31. Фa4 b5 32. Лa8 ba 33. Л:c8+ Kph7 34. Лh8+ Kpg6 35. e5 C:e5 36. C:e5 f6, 0:1.

Варвара Палякова — Марына Хоміч. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. Kd2 de 4. K:e4 Cf5 5. Kg3 Cg6 6. h4 h6 7. Kh3 e6 8. Kf4 Ch7 9. c3 Kf6 10. Cd3 C:d3 11. Ф:d3 Kbd7 12. 0-0 Cd6 13. Лe1 0-0 14. Фf3 Kd5 15. Kfh5 K5f6 16. Ke4 Ce7 17. Ke:f6+ K:f6 18. C:h6 K:h5 19. Ф:h5 C:h4 20. Лe4 Cf6 21. Лg4 Фd5 22. Л:g7+ Kph8 23. Cg5+ Kp:g7 24. Фh6+, 1:0.

І адна партыя з першай лігі.

Маргарыта Бендзік — Ксенія Норман. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. Cg5 h6 5. Ch4 d6 6. Kf3 0-0 7. e3 Kbd7 8. Ce2 c6 9. 0-0 g5 10. Cg3 Kh5 11. Kd2 K:g3 12. hg f5 13. Фc2 e5 14. Kb3 a5 15. a4 g4 16. Лfd1 Фg5 17. Cf1 h5 18. d5 Лf6 19. c5 dc 20. dc bc 21. Лac1 Cf8 22. Cc4+ Kph8 23. Ke2 Kb6 24. Kd2 Cd6 25. Kph2 Лh6 26. Лh1 Лa7 27. Kpg1 Лah7 28. Kpf1 Kd5 29. Kg1 Фe7 30. b3 Ce6 31. Фb2 Kpg8 32. Ke2 h4 33. gh Л:h4 34. Л:h4 Ф:h4 35. Kg3 e4 36. Kpe2 C:g3 37. fg Ф:g3, 0:1.

* * *

Прызавую тройку Алімпійскіх дзён моладзі склалі каманды Мінска, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей.

Фінішаваў матч па завочных шахматах Беларусь — Германія, які працягваўся два гады на 50 дошках. Перамаглі нямецкія шахматысты — 51,5:48,5.

* * *

У мінулым выпуску мы расказвалі, што камісія па шахматнай кампазіцыі Федэрацыі шахмат Свярдлоўскай вобласці і часопіс «Уральский проблемист» арганізоўваюць конкурсы, прысвечаныя ўральскім кампазітарам. Вось яшчэ два з іх.

Міжнародны юбілейны конкурс задач на кааператыўны мат «Аляксей Івунін — 75» па раздзелах h#2; h#2,5-3; h#3,5-4; h#4,5-n. Па кожным раздзеле будуць выдзелены мініяцюры. Задачы-дуплекс прысылаць не трэба. Суддзя — юбіляр. Задачы на дыяграмах з поўным рашэннем і каментарыямі дасылаць да 10 верасня 2022 года на электронны адрас: ivunin@bk.ru

Міжнародны юбілейны конкурс па двухходоўках-мініяцюрах «Вячаслаў Пільчанка — 70».

Суддзя — юбіляр. Задачы на дыяграмах з поўным рашэннем і каментарыямі дасылаць да 1 верасня 2022 года на электронны адрас: pilchenkovk@yandex.ru

Вынікі конкурсаў будуць апублікаваныя на сайце www.selivanov.world і ў часопісе «Уральский проблемист».

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. b6! (1. Фc5? Kpb8!). Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ВЫХАДНЫЯ З ТЭАТРАЛЬНЫМ УХІЛАМ

**Штогод, 27 сакавіка, ва ўсім свеце адзначаецца Сусветны дзень тэатра. Свята ўсіх, хто стварае сваім прафесіяналізмам магію на сцэне. Яно традыцыйна праходзіць пад дэвізам «Тэатр як сродак узаемаразумення і ўмацавання міру паміж народамі». Прыхільнікі тэатральнага мастацтва змогуць адсвяткаваць гэты дзень у тым ліку і далучыўшыся да прагляду спектакляў і праграм з удзелам дзеячаў тэатральнай сферы на «Беларусь 3».**





Напярэдадні свята ў суботу, 26 сакавіка, ў эфіры сацыякультурнага канала можна паглядзець праект «Камертон», дзе госцем выпуску будзе драматург, сцэнарыст, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Аляксей Дудараў. Разам з майстрам слова аўдыторыя здзейсніць падарожжа па яго творчай біяграфіі. «Драматургія, на мой погляд, самы складаны жанр. Ты павінен быць і паэтам, і філосафам, і празаікам, але больш за ўсё ты павінен адчуваць, што слова са сцэны — яно іншае, чым проста слова», — кажа Аляксей Ануфрыевіч. І гэта сапраўды так, калі ўвогуле казаць пра тэатральнае мастацтва. Бо на сцэне ўвасабляюцца гісторыі, якія распавядаюцца не проста словамі і дзеяннямі акцёраў, але і праз шматлікія дэталі ў музыцы, у дэкарацыях, у касцюмах і г. д. А самае, бадай, галоўнае, што тут ніколі не бывае другога дубля, штораз нараджаюцца новыя эмоцыі і танальнасці як для стваральнікаў спектакля, так і для гледачоў.

Адразу пасля запланаваны паказ драматычнай балады «Не пакідай мяне...». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа прысвечаны 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Даніна памяці тым, хто цаной уласнага жыцця наблізіў Перамогу над фашызмам. А яшчэ пра тое, наколькі вайна сваёй жорсткасцю, антыгуманнасцю, ненармальнасцю супярэчыць чалавечай прыродзе, прызначэнню чалавека на Зямлі», — такія словы аб пастаноўцы можна знайсці на сайце тэатра, але лепш за ўсё паглядзець і прыслухацца пасля да ўласных адчуванняў. А вечарам на «Беларусь 3» — опера «Дзікае паляванне караля Стаха» Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Пастаноўка адносна нядаўна набыла новае гучанне ў рэжысёрскім бачанні Ганны Маторнай.

У нядзелю ўбачым балет «Анастасія» Вячаслава Кузняцова таксама ў пастаноўцы Тэатра оперы і балета. Гісторыя пра Анастасію Слуцкую — яшчэ адзін напамін, што беларуская зямля мае багатае гістарычнае мінулае і годных герояў... Не абыдзецца і без прэм'ер у гэты дзень. Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Мікітаў лапаць» па творы Міхася Чарота пакажуць бліжэй да вечара. Камедыя пра сялянскае жыццё і каханне падорыць кожнаму добры настрой. Па заканчэнні пастаноўкі глядзіце выпуск праекта «Кадры жыцця» з удзелам рэжысёра, народнага артыста Беларусі Аляксандра Яфрэмава.

Выбірайце свае спектаклі, згадвайце любімых акцёраў і часцей наведвайце тэатры. А ўсіх, хто служыць у імя тэатральнага мастацтва, віншуем з надыходзячым святам! Вы робіце наш свет лепшым!

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з сайтаў тэатраў.**

«Са «Звяздою» — спадручней!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 прасаў Holt HT-IR-010 і суперпрыз — пыласос Samsung VCC4131S3A/XEV. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26 красавіка 2022 года.

